# КРАЯЗНАЎЧЫ МАРШРУТ
# “ПАМЯТНЫЯ МЯСЦІНЫ ІЛЬЯНШЧЫНЫ”

**Аўтары:** навучэнцы 6,7 класаў ДУА “Ільянская сярэдняя школа імя А.А. Грымаця”.

**Кіраўнікі:** Маркевіч Люцыя Францаўна, кіраўнік школьнага народнага музея “Ільянскія далягляды”, Шушкевіч Аксана Аляксееўна, кіраўнік школьнага народнага музея “Вілейшчына літаратурная” дзяржаўнай установы адукацыі “Ільянская сярэдняя школа імя А.А. Грымаця”.

**Мэта экскурсіі:** азнаямленне з памятнымі мясцінамі Ільяншчыны, выхаванне пачуцця грамадзянскасці і патрыятызму.

**Задачы экскурсіі:** зацікавіць жыхароў і гасцей нашага рэгіёна важнай краязнаўчай інфармацыяй;

прадставіць пазнавальныя і рэкрэацыйныя магчымасці цудоўнага краю і здабыць новыя звесткі пра малую Радзіму;

прапагандаваць дзейнасць школьных народных музеяў дзяржаўнай установы адукацыі “Ільянская сярэдняя школа імя А.А. Грымаця”.

**Тып экскурсіі:** краязнаўчая.

**Від экскурсіі:** аўтамабільна-пешая.

**Доўжыцца экскурсія:** 5 гадзін 14 хвілін

**Працягласць** – 30,5 км

**Маршрут экскурсіі:** месца сустрэчы з групай Вілейскі раён, аг.Ілья, вул. Школьная, 1а

в.Ілья – в.Абадоўцы – в.Бязводнае – в.Кавалі – в.Баяры – в.Барсукі – в.Суднікі – в. Калодчына – в.Асцюковічы – в.Ілья.

**Змест экскурсіі:**

У распрацаваны маршрут уключаны разнастайныя аб’екты, што дазваляе зацікавіць шырокае кола наведвальнікаў.

Маршрут знаходзіцца на шляху да зон адпачынку, месц паломніцтва, побач са значнымі турыстычнымі аб’ектамі. Гэта дае магчымасць экскурсантам шмат пабачыць і даведацца, нават проста адпачыць. Ён можа быць прапанаваны аматарам розных відаў транспарту. Прыводзяцца змястоўныя гістарычныя факты з выкарыстаннем літаратурных крыніц, а таксама тыя, якія атрыманы ад розных людзей у час сустрэчы з імі ў школе ці ў паходах і экскурсіях.

Уключаныя ў маршрут навакольныя вёскі – найкаштоўнейшыя аб’екты краязнаўства.

**Агульныя метадычныя ўказанні да тэмы экскурсіі:**

- экскурсавод павінен мець вялікі запас ведаў аб аб’ектах экскурсіі;
- экскурсія павінна весціся ў адпаведнасці з патрабаваннямі дыферэнцыраванага падыходу.

Агульныя арганізацыйныя ўказанні:

падчас экскурсіі строга сачыць за выкананнем правілаў бяспекі ўдзельнікамі экскурсіі, правілаў дарожнага руху, інструктаваць экскурсантаў аб захаванні нормаў бяспекі пры аглядзе аб'ектаў.

**Уступ да экскурсіі:**

Арганізацыйны ўступ зрабіць пры сустрэчы з групай да пачатку руху, прадставіцца групе, абгаварыць неабходныя арганізацыйныя пытанні і нагадаць аб правілах паводзін падчас экскурсіі і нормах бяспекі;

у інфармацыйнай частцы ўступу коратка паведаміць аб тэме і асноўных аб'ектах экскурсіі;

наладзіць экскурсантаў на ўспрыманне маючай адбыцца экскурсіі і ўсталяваць з імі эмацыйна-псіхалагічны кантакт;

працягласць ўступлення 5 хвілін;

**Заключэнне.**

Заключэнне зрабіць ля каталіцкага касцёла “Найсвяцейшае Сэрца Езуса”

Працягласць заключэння – 5 хвілін.

## ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА МАРШРУТА ЭКСКУРСІІ “ПАМЯТНЫЯ МЯСЦІНЫ ІЛЬЯНШЧЫНЫ”

| Маршрут | Месца прыпынку | Аб’ект паказу | Працягласць паказу | Найменне падтэмы і асноўныя пытанні | Арганізацыйныя пытанні | Метадычныя ўказанні |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Уступленне** | | | | | | |
| аг. Ілья<br><br>ДУА “Ільянская сярэдняя школа імя А.А.Грымаця” | Пляцоўка каля школы | аг.Ілья<br>вул. Школьная, 1 А | 5 хв. | Сустрэча і кароткае знаёмства з групай. | Знаёмства з правіламі паводзін падчас экскурсіі, парадку перамяшчэння, размяшчэння на месцах прыпынкаў (пакіданне месцаў для праходу), мер бяспекі і парадак задачы пытанняў (у канцы экскурсіі). | Прапанаваць групе знаходзіцца паўкругам не больш чым у два рады. |
| | | Школьныя народныя музеі “Ільянскія далягляды”, “Вілейшчына літаратурная”. | 30 хв. | Абзорныя экскурсіі з экскурсаводамі | Экскурсію праводзяць экскурсаводы, навучэнцы 6,7 класаў. Наведвальнікі дзеляцца на 2 групы. | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| | | Памятны камень у гонар Змітрака Бядулі | 5 хв. | Звесткі пра гады вучобы Змітрака Бядулі ў Ільянскім ешыбоце | Група размяшчаецца паўкругам | |
| **Пераезд у в.Абадоўцы 6 км (10 хв.)** | | | | | | |
| в.Абадоўцы | Пляцоўка перад капліцай-усыпальніцай | Капліца-ўсыпальніца, сядзіба Багдановічаў, руіны вінакурні, гаспадарчыя пабудовы 19 стагоддзя | 30 хв. | Экскурсія “Гісторыя роду паноў Багдановічаў”, паказ гаспадарчых пабудоў 19 стагоддзя | Група размяшчаецца паўкругам. Экскурсію праводзіць экскурсавод. | Выкарыстоўваць прыёмы паказу і аповеду (экскурсійнай даведкі). |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Пераезд у в.Бязводнае 2 км (4 хв.)** | | | | | | |
| в.Бязводнае | На ўскрайку лесу | Гарадзішча – жалезаробчы цэнтр | 15 хв. | Паказ месц знаходжання Гарадзішча, жалезаробчага цэнтра | Група размяшчаецца паўкругам. Экскурсію праводзіць экскурсавод. | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, лакалізацыі падзей, экскурсійнай даведкі. |
| **Пераезд у в.Кавалі 2 км (4 хв.)** | | | | | | |
| в.Кавалі | Пляцоўка перад хатай Веры Буркевіч, вязня канцлагера | Вязень канцлагера Вера Буркевіч | 20 хв. | Аповед Веры Буркевіч пра дзяцінства, апаленае вайной | Група размяшчаецца паўкругам. Гутарка праходзіць у форме дыялогу | Выкарыстоўваць прыёмы паказу і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| **Пераезд у в.Баяры 2 км (4 хв.)** | | | | | | |
| в.Баяры | Пляцоўка перад хатай, дзе нарадзіўся член Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван Лашутка | Хата, дзе нарадзіўся член Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван Лашутка | 15 хв. | Знаёмства з жыццёвым і творчым шляхам Івана Лашуткі | Група размяшчаецца паўкругам. | Выкарыстоўваць прыёмы паказу і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| **Пераезд у в.Барсукі 2 км (4 хв.)** | | | | | | |
| в.Барсукі | На месцы кургана | Сядзіба пана Барсука. Курган “Панская гара”. | 15 хв. | Агляд рэштнаў маёнтка пана Барсука | Экскурсію праводзіць экскурсавод. | Выкарыстоўваць прыёмы паказу і аповеду (экскурсійнай даведкі). |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Пераезд у в.Суднікі 2 км (4 хв.)** | | | | | | |
| в.Суднікі | Каля капліцы на могілках | Капліца на могілках – каменныя магілы – радзіма майстра баянаў Мікалая Судніка | 15 хв. | Агляд гістарычных аб’ектаў, знаёмства з біяграфіяй майстра баянаў Мікалая Судніка | Група размяшчаецца паўкругам. Экскурсію праводзіць экскурсавод. | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, лакалізацыі падзей, экскурсійнай даведкі. |
| **Пераезд у в.Калодчына 3 км (6 хв.)** | | | | | | |
| в.Калодчына | Пляцоўка перад хатай алімпійскага чэмпіёна А.Г.Газава | Радзіма дзеяча рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі Я.Е.Гаўрыліка, месца жыхарства алімпійскага чэмпіёна А.Г.Газава сядзіба паноў Тукалаў | 25 хв. | Размова з алімпійскім чэмпіёнам А.Г.Газавым, знаёмства з дзеячам рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі Я.Е.Гаўрыліка | Група размяшчаецца паўкругам. Гутарка праходзіць у форме дыялогу | Выкарыстоўваць прыёмы паказу і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| **Пераезд у в.Асцюковічы 6 км (10 хв.)** | | | | | | |
| в.Асцюковічы | Пляцоўка перад паркам Парк | Сядзіба паноў Тукалаў | 15 хв. | Знаёмства з гісторыяй роду паноў Тукалаў, агляд былой сядзібы | Група размяшчаецца паўкругам. Экскурсію праводзіць экскурсавод. | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, лакалізацыі падзей, экскурсійнай даведкі. |
| **Пераезд у аг.Ільля да месца растрэлу яўрэяў у гады Вялікай Айчыннай вайны 4 км (7 хв.)** | | | | | | |
| аг.Ільля Месца растрэлу | Пляцоўка каля помніка на месцы | Помнік на месцы пахавання | 15 хв. | Звесткі пра яўрэяў, жыхароў Ільі, якія загінулі ў час Халакосту | Група размяшчаецца паўкругам. | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| яўрэяў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Помнік на месцы пахавання | пахавання | | | | | лакалізацыі падзей, экскурсійнай даведкі. |
| **Пераезд да Брацкай магілы савецкіх воінаў і партызан 0,5 км (2 хв.)** | | | | | | |
| аг. Ілья Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан | Пляцоўка каля помніка | Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан | 15 хв. | Звесткі аб загінуўшых савецкіх салдатах і партызанах ў чэрвені 1944 года | Група размяшчаецца паўкругам. | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, лакалізацыі падзей, экскурсійнай даведкі. |
| **Пераезд да Свята-Ільінскай праваслаўнай царквы 0,5 км (2 хв.)** | | | | | | |
| аг. Ілья Свята-Ільінская праваслаўная царква. | Пляцоўка каля царквы | Свята-Ільінская праваслаўная царква. | 15 хв. | Звесткі аб Свята-Ільінскай праваслаўнай царкве | Група размяшчаецца паўкругам. | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд, нагляднасць) і аповеду (экскурсійнай даведкі). |
| **Пераезд да каталіцкага касцёла "Найсвяцейшае Сэрца Езуса 0,5 км (2 хв.)** | | | | | | |
| аг. Ілья Каталіцкі касцёл "Найсвяцейшае Сэрца Езуса" | Пляцоўка каля касцёла | Каталіцкі касцёл "Найсвяцейшае Сэрца Езуса" | 15 хв. | Звесткі аб каталіцкім касцёле "Найсвяцейшае Сэрца Езуса" | Група размяшчаецца паўкругам. | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, лакалізацыі падзей, экскурсійнай даведкі. |
| **Заключэнне.** Кароткі агляд аб'ектаў, з якімі пазнаёміліся ў час экскурсіі. 5 хв. | | | | | | |



**Фота 1. ДУА “Ільянская сярэдняя школа імя А.А.Грымаця”**



**Фота 2. Школьны народны музей “Вілейшчына літаратурная”**



**Фота 3. Школьны народны музей “Ільянскія далягляды”**



**Фота 4. Капліца ў в.Абадоўцы**



**Фота 5. Гаспадарчыя пабудовы 19 ст. у в.Абадоўцы**



**Фота 6. Вінакурня ў в.Абадоўцы**




**Фота 7. Месца растрэлу яўрэяў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Помнік на месцы пахавання**



**Фота 8. Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан**



**Фота 9. Свята-Ільінская праваслаўная царква**



**Фота 10. Каталіцкі касцёл “Найсвяцейшае Сэрца Езуса”**